Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс [illegible] Вільня, Віленс[illegible] (...нейска 12. м. 6) Рэдакцыя адч[illegible] на 2 разд. штодня, апрача сьвяточн[illegible] Адміністр. ад 9 да 3.

Падпісная на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвае даражэй. Перамена адраса 20 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 44 | Вільня, Субота 3-га верасьня 1927 г. | Год I

ГРАМАДЗЯНЕ!

Дамагайцеся сваей роднай беларускай школы, бо яна ёсьць мілейшая і бліжэйшая да душы Вашых дзетак.

Навука ў роднай беларускай мове больш зразумелая для Вашых дзетак, як у іншых мовах!

Кожны народ мае сваю родную школу, дык і нашыя беларускія дзеткі маюць на яе права, якога ніхто ня можа ад іх адабраць.

Складайце Школьнаму Інспэктару як можна больш дэклярацыяў, каб для вашых дзетак адчынілі ўрадовую беларускую школу, або ператварылі істнуючую польскую на беларускую.

Ня гледзячы на тое, што ўрад ня даў Вам беларускае школы на дэклярацыі, зложаныя Вамі ў мінулыя гады, **падавайце нанова дэклярацыі ды яшчэ ў большым ліку.**

Калі на Вашы дамаганьні ўрад адчыніў двухязыкную, гэта значыць польска-беларускую школу, дык усёроўна складайце дэклярацыі, каб адчынілі чыстую белар. школу.

Ня бойцеся запугваньняў нясумленных людзей, якія рознымі спосабамі будуць нагаварваць, каб Вы не падавалі дэклярацыяў на беларускую школу.

Падавайце ў Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы ў Вільні—сьв. Ганны № 2— імёны і прозьвішчы тых, хто будзе Вас адгаварваць, або запугваць.

Аб усякіх надужыцьцях, ці то збоку паліцыі, ці адміністрацыі, ці гміны,ці прыватных асобаў безадкладна падавайце ў Галоўную Управу, каб пацягнуць іх да судовае адказнасьці за нагвалчаньне Вашых правоў, закону ад 31./VII. 1924 г. і распараджэньня Міністра Асьветы ад 7./I. 1925 г.

Дэклярацыі і інструкцыі выпісвайце з Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы — Вільня, вул. Сьв. Ганны № 2.

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы.

Сэнсацыйныя заявы праф. Гэрбачэўскага.

Ведамы барацьбіт за польска-літоўскае паразуменьне праф. Гэрбачэўскі — па дарозе з Польшчы ў Літву дамоў—зрабіў дзьве цікаўныя заявы. Адна з іх зьмешчана ў нямецкай газэце, другая—ужо ў ковенскай.

„Нямецкая“ гутарка праф. Гэрбачэўскага кажа, што пакуль-што, як ён высьвяліў, рэальна магчыма толькі гаспадарчае паразуменьне між абыдвума краямі. А палітычнае будзе магчыма толькі тады, калі Літва радыкальна зьменіць сваю польскую, ці лепш: антыпольскую палітыку... Гэта мае значыць— калі адмовіцца ад Вільні... Але літоўскае грамадзянства за гэтулькі гадоў „вайны з Польшчай“ так прасякнута ненавісьцяй да яе, што навет для сучаснага ўраду зьмяніць настроі ўнутры Літвы — вельмі цяжка... Польшча павінна неяк аблягчыць літоўскаму ўраду яго цяжкую задачу („супакоіць“ свае грамадзянства). Польшча павінна разумець, што яе інтарэсы ляжаць больш на ўсходзе, чым на захадзе.—Калі будзе вырашана яе ўсходняя праблема, а асабліва транзіт праз Літву і Клайпэду, дык лягчэй будзе вырашана пытаньне і небясьпечнага з пункту гледжаньня эўрапэйскага міру „польскага калідору“. Для Літвы-ж быццам—няма выбару: бо-ж **толькі сваячаснае паразуменьне з Польшчай адратуе Літву ад... польскай ваеннай акупацыі!** Што-ж датычыць гэтага мірнага паразуменьня, дык быццам марш. Пілсудскі гатовы зрабіць вельмі значныя ўступкі (ці—зрабіць нешта меншае, як ваенная акупацыя?!), а іменна: абвясьціць Віленшчыну „асобным округам“ („Сярэдняй Літвой“?!), склікаць (ізноў?!) Віленскі Сойм, які, можа, распачаў-бы далейшыя гутаркі з Літвой — беспасрэдна... і г. д...

„Літоўская“ гутарка п. Гэрбачэўскага крыху іншага характару...—Перадусім праф. падчыркнуў, што ягоная падарожа ў Польшчу мела „выключна асабісты характар“... (Мы памятаем, што яшчэ зусім нядаўна той-жа п. Гэрбачэўскі „рэвэляваў“ у Варшаве, што аднак-жа „гутарыць“ ён — на падставе „асабістага даручэньня старшыні літоўскага ўраду“!). Далей ён падчыркнуў вялікія і дадатнія ўплывы, якія мела яго акцыя ў Варшаве на польскае грамадзянства, якое—пасьля ягоных гутарак і артыкулаў — зрабілася страшэнна ўступлівым—на карысьць Літвы— і хочаісьці шляхам мірнага з ёй паразуменьня... Але—„палякі — народ горды“, дык яны чакаюць, каб Літва зрабілі першы крок (у „нямецкай“ гутарцы праф. Гэрбачэўскі казаў, што—палякам трэба зрабіць „крок“ — першым!), а гэта перадусім дзеля таго, што Літва заяўляе дагэтуль, што яна — „ў вайне з Польшчай“... Дык трэба, каб літоўскі ўрад ...„абвясьціў замірэньне“... Тады,—кажа праф. Гэрбачэўскі,—я пераконаны, што **польскі ўрад зробіць зараз жа вельмі важныя палітычныя і гаспадарчыя прапазіцыі Літве“**... Перадусім, — кажа ён,—калі Літва згодзіцца „выключыць віленскае пытаньне з справы паразуменьня з Польшчай, тады Польшча... ня будзе навет трэбаваць, каб Літва прызнала пастанову Рады Паслоў, прысудзіўшай Віленшчыну Польшчы“... Вось аж чаго дабіўся праф. Гэрб. ад польскага грамадзянства! Тады—„пытаньне аб Вільні асталося-б зусім... адкрытым — к вялікаму маральнаму здаваленьню Літвы“... Далей праф. Гэрбачэўскі кажа, быццам палякоў асабліва абурае тое, што свае прэтэнсіі на Віленшчыну Літва апірае на этнаграфічных падставах, лічучы яе насяленьне „літоўскім“... Трэба, каб літоўцы адмовіліся ад гэтага (запраўды-ж недарэчнага, але толькі не на карысьць палякоў! Рэд.) аргумэнту.—Трэба, каб літоўцы казалі толькі аб „гісторыі“, казалі аб тым, што — „Вільня была калісьці сталіцай Літвы“,—пэўна-ж таксама „гістарычнай“. але не этнаграфічнай,—інакш кажучы, сталіцай Літвы — пад Польшчай... перапрашаем: „у ўніі з Польшчай“... Тады быццам палякі згадзіліся-бы выдзяліць Віленшчыну ў асобны — аўтаномны—округ з сваім Соймам, а праз яго ўлады можна-б было ўстанавіць адносіны і з літоўскім урадам дзеля далейшага „паразуменьня“, ці — мо‘ папросту, „новай уніі“...

Праф. Гэрбачэўскі дадаў, што гэты праект мае шмат прыхільнікаў, асабліва сярод віленскіх палякоў... Быццам не варожа адносяцца да яго і некаторыя паважныя варшаўскія палітыкі, з якімі ён гутарыў, — як праф. Ашкеназы і іншыя...

Прыводзім усе гэтыя пекныя мяркаваньні—дзеля іх цікаўнасьці, бо запраўды-ж, чаго яшчэ ня можа быць з нашай Віленшчынай? Чаго-ж таксама ня здолеюць зрабіць з літоўскім народам і грамадзянствам іх сучасныя павадыры-фашысты—пад магутным націскам ведамых літоўскіх „апякуноў“, пад іх „ласкавымі пагрозамі“ — польскай ваеннай акупацыяй?!

Вялізарная стыхійная катастрофа.

У Усходняй Галічыне гэтымі днямі сталася вялізарная стыхійная катастрофа.

Пасьля страшэннае буры і ліўня, разьліліся рэкі Сан, Днестр, Дрвёнж, Ляніўка і Быстрыца. На палёх несабранае яшчэ збожжа зьнішчана. Сарваны масты. На Сане вада паднялася ажно на сем мэтраў. У некалькіх месцах чыгункавы шлях разарваны. Заліты рад пасёлкаў і вёсак, а такжа прадмесьце Самбора, Падгор‘е, і часьць Перамышля.

Таксама заліты цэнтр дабычы нафты Барыслаў. Поў места стаіць пад вадой. Дзьве вялікія камяніцы пад націскам вады заваліліся, пахаваўшы пад сваімі руінамі многа людзей. Паважная небясьпека пагражае вялікім рафінэрыям „Польмін“ і „Галіцыя“.

Агулам пацярпела больш за сто гмінаў.

Страты матэрыяльныя — неаблічальныя; многа ахвяр людзьмі.

Прычына калатні.

Блізу кожын дзень прыносе нам вестку аб заснаваньні ўсё новых і новых палітычных партыяў у Заходняй Беларусі. Ад часу нараджэньня Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады, разгромленае пасьля польскімі ўладамі, як грыбы пасьля дажджу, пачалі паказываць свае галовы і заяўляць аб сваім існаваньні і хадэкі, і сельсаюзьнікі дваякага тыпу, і паўлюкевічавы „нацыяналісты незалежнікі“ з „русским душком“, і такія-ж „незалежнікі“ Умястоўскага і Гурына з чыста-польскім духам, і Бонаўскія „радыкалы“, і ўрэшце Мамонькавыя „эсэры“... І слухае іх беларускі селянін, чытае іхнія праграмы, звычайна напісаныя вельмі лоўка і заманчыва, ды ніяк у цям узяць ня можа, чым яны розьняцца паміж сабой, ды чаму польскія ўлады адным з іх дазваляюць гаварыць і пісаць аб незалежнасьці Беларусі, а то і прыкрыя „камплімэнты“ Польшчы зьмяшчаць у сваіх адозвах, а другія за тое-ж абвяшчаюцца „антыпаньствовымі“, ды павадыроў іх садзяць у вастрогі, не зважаючы навет на іх пасольскую нятыкальнасьць?!..

Вось-жа справа тутака дужа простая. Існуюць запраўды толькі *два прынцыпова розныя кірункі* сярод беларусаў пад Польшчай: адзін—гэта той, які йдзе пад сялянска-работніцкім сьцягам і імкнецца ўладу буржуазіі *замяніць* уладай сялян і работнікаў: другі — ці агулам усе другія групы і партыі, ня гледзячы на розьніцы ў назовах,—той, які сваю ідэалёгію грунтуе на *далейшым панаваньні буржуазіі*, побач з якой мелі-бы ў дзяржаўным жыцьці нейкую мяйсьцінку і працоўныя клясы, *дзелючыся ўладай* у дзяржаве *з буржуазіяй.*

Ясна, што з першым кірункам, які імкнецца цалком адняць уладу ад сучасных паноў палажэньня і аддаць гэту ўладу працоўным, ніводная буржуазная дзяржава ня можа пагадзіцца і змагаецца з ім усімі даступнымі ей спосабамі. Ясна, што пануючая цяпер у нас буржуазія — ў дадатку навет і па нацыянальнасьці чужая нашаму сялянству і работнікам— ніколі ня згодзіцца на самаахвотнае адрачэньне ад сваей сучаснай улады. Ясна, што замена ўлады аднае клясы ўладай другое ня можа адбыцца без барацьбы, у якой пераможа той, хто акажацца дужэйшым.—Вось чаму буржуазная ўлада Польшчы змагаецца самым рашучым спосабам з сялянска-работніцкім рухам, які імкнецца да зваленьня яе панаваньня, і—наадварот — годзіцца і згаварываецца (яўна, або тайна!) з усім тымі кірункамі і партыйнымі арганізацыямі, якія вымагаюць для працоўных адно толькі самага скромнага куточка за тым сытым сталом, за якім так выгодна сядзіць буржуазія. Бо-ж пры такім „падзеле“ ўлады, пры такім „супрацоўніцтве“ сялян і работнікаў з абшарнікамі, фабрыкантамі і капіталістамі—апошнія, як больш багатыя і грашмі і культурнымі сіламі, заўсёды будуць іграць кіруючую ролю ў дзяржаўным жыцьці, заўсёды пакіруюць гэтым жыцьцём так, каб на чым-даўжэйшы час забясьпечыць сабе сваё сучаснае вельмі выгоднае становішча...

Найлепшым прыкладам такога роду „супрацоўніцтва“ і „падзелу ўлады“ паміж варожымі сабе ўзаемна клясамі зьяўляецца хаця-бы сучасны польскі Сойм. Бо-ж іменна тут найбольш гаворыцца пекных слоў аб роўнасьці ўсіх клясаў і станаў, ды найменш робіцца для працоўных, а найбольш—для буржуазіі...

Ня будзем на гэтым месцы затрымлівацца над ацэнкай аднаго і другога кірунку: хай гэта кожын сам сабе зробе. Адзначаем толькі той *падставовы падзел* нашага грамадзянства паводле ідэалёгіі, — падзел, які зьяўляецца падставай дзеля тварэньня розных партыйных групаў і арганізацыяў, адны з якіх бязмілАсэрна разьбіваюцца пануючай буржуазіяй, другія-ж — ня гледзячы на часта вострыя словы і пекныя лёзунгі — дужа добра ўжываюцца з панамі палажэньня, выжыдаючы, ці не ўпадзе і для іх нейкая крошка з панскага стала.

Карацей: мы маем у нашым грамадзянстве—з аднаго боку—*сялянска-работніцкую барацьбяную ідэалёгію*, з другога—*ідэалёгію згодніцтва з буржуазіяй*, — і яны вядуць паміж сабой ня менш вострую барацьбу, чым тая барацьба, каторую вядуць з буржуазіяй працоўныя масы. І трэба гэта сабе добра ўясьніць кожнаму беларусу, каб ён мог зразумець тое—на-пагляд—дзіўное зьявішча нейкае незразумелае калатні, што ў бяспрыкладна вострай форме выяўляецца ў беларускай прэсе і міжпартыйных адносінах.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Новы радавы пасол у Варшаве.

Газэты даведаліся, быццам радавы ўрад мае назначыць за пасла ў Варшаве Богомолова, які да таго быў паўнамоцнікам СССР у Вене, а пасьля першым раднікам радавага пасольства ў Лёндане—перад Рэзэнгольцам.

Польска-нямецкая гаспадарчая вайна завастраецца.

Польскі ўрад устанавіў толькі-што новыя стаўкі мытаў на тавары, якія ідуць у Польшчу з краёў, ня маючых з ёй гаспадарчых трактатаў. Новыя мытныя стаўкі — падвойныя ў прыраўнаньні да тых, якія назначаны для краёў, зьвязаных з Польшчай гандлёвымі ўмовамі. Такія максымальныя мыты маюць, як ведама, ня толькі абаронны (для краёвай прамысловасьці), але і — забаронны (для загранічных краёў) характар. Ясна ўсім, што гэтыя забаронныя мыты маюць біць галоўным чынам па нямецкім увозе ў Польшчу. З Нямеччынай Польшча ўжо каля 2 гадоў ня мае гарговай умовы, з якой немцы неяк і не сьпяшаюцца. Новыя мытныя стаўкі аднак-жа маюць быць уведзены толькі — праз 4 месяцы. Дык да Новага Году польскі ўрад дае Нямеччыне час—адумацца.

Што чуваць з амэрыканскай пазыкай для Польшчы.

Як ведама, ужо зусім падпісаная амэрыканская пазыка для Польшчы была толькі—адложана на восень. Адложана дзеля таго,—як пісалася тады, — што быццам у той мамэнт, улетку, амэрыканскі грашовы рынак быў „дрэнна настроены дзеля пазыкаў наагул“.

Дзіўная рэч. Добра ведаючы гэтыя справы „Кур. Варшавскі“ няраз сцьвярджаў, што якраз тады, улетку, амэрыканскі грашовы рынак быў — вельмі добра настроены, бо-ж навет панізіў процант на пазыкі на цэлую палову. А вось цяпер газэты праводзяць цэлы рад дадзеных аб тым, што якраз улетку Амэрыка дала каля ста мільёнаў пазыкаў адной Нямеччыне. Дык грошы ёсьць — і ня толькі ёсьць, але папросту шукаюць, куды-б улажыцца...

Ну, хай сабе так і было дрэнна на гэтым „бедным“ грашмі амэрыканскім рынку ўлетку... Але вось цяпер ужо падыйшла восень.—Дык „Роботнік“ слушна пытаецца ў польскага міністра Скарбу, чаму гэта нічоганічагусенькі ня чуваць аб выкананьні ўжо падпісанай пазыкі, якая толькі была адложана на восень?!.

Цікаўныя рэвэляцыі „Кур. Польскага“.

„Кур. Польскі“ падае такую цікаўную вестку ці чутку.

„Пацiху, але даволі ўпорна сёньня ўжо гаворыцца аб спробах паразуменьня між кіраўнічымі коламі „санатараў“ (пілсудчыкаў! — *Рэд.*) і пэўнымі групамі правіцы, якія дагэтуль трымаліся ў заядлай апазіцыі“.

Ці-ж можна сумлявацца ў тым, што справа йдзе—аб эндэцыі?! А гэта зусім пацьвярджае нашыя думкі аб магчымасьці паразуменьня між урадам і правай большасьцю Сойму—перадусім у справе зьмены выбарнага закону. Бо ж ясна, што галоўным матывам спробаў гэтага паразуменьня зьяўляецца нішто іншае, як іменна гэта. Каб толькі дабіцца абмяжаваньня правоў і палітычнай сілы меншасьцяў у Польшчы дый „загарантаваць польскасьць на крэсах“, эндэцыя дый уся правіца з цэнтрам пойдзе літаральна на ўсё!..

Эндэцыя аб разьбіцьці кангрэсу меншасьцяў.

Галоўны орган эндэцыі „Газ. Поранна Варшавска“ страшэнна ўсьцешылася з прычыны „разьбіцьця“ кангрэсу меншасьцяў у Жэнэве; кангрэсу, які меў на мэце—разваліваць „народовыя дзяржавы“ дый зьвязываць свабоду руху іх уладаў унутры краю і ў іх заграчічнай палітыцы.

Няменш абураецца шляхотная газэта на жыдоўскі кангрэс, які высунуў зусім „шалёныя дамаганьні“ — „нацыянальнай і фінансавай аўтаноміі для жыдоў у Польшчы“, дый яшчэ—права ўжываць у зносінах з уладамі сваю жыдоўскую мову там, дзе жыдоўскага насяленьня нямеш, як 20 проц. Гэта-ж значыць—амаль не ўва ўсіх местах ды мястэчках Польшчы мясцовыя ўлады павінны былі-б ведаць жыдоўскую мову, а прынамся — трымаць перакладчыкаў...

Ізноў арышты сярод украінцаў у Галічыне.

У Кракаве ізноў зроблены рад арыштаў —пераважна сярод украінцаў, абвінавачаных у стварэньні тайнай арганізацыі з мэтай шпіёнства на карысьць Нямеччыны. Галоўныя арышты ў гэтай справе, як мы памятаем, адбыліся ў ліпні с. г. Цяпер дадаткова арыштавана шмат асоб у Львове, Станіславове і на правінцыі.

Але з далейшых вестак „ПАТ'а“ аказываецца, што сярод „некалькіх дзесяткоў арыштаваных ёсьць рад жаўнераў, а навет адзін—падпалкоўнік польскай арміі, які вёў шпіёнскую акцыю“... Дык ці-ж і гэты падпалкоўнік—таксама ўкраінец?..

Адзін з арыштаваных пасьпеў зьесьці найважнейшыя дакумэнты... Раскрытая афэра, цьвердзіць агенцтва, захоплівае ўсё шырэйшыя колы...

Зыскі Відзэўскай Мануфактуры.

Польскае Агенцтва паведаміла, што ведамая Відзэўская Мануфактура дала сваім акцыянэрам за 1926 г. усяго зыску 200 мільёнаў злотых... „Роботнік“ напамінае пры гэтым, што гэткія „законныя ды чэсныя“ зыскі паны „прамысловыя бароны“ выкалачываюць, дзякуючы працы 12 — 14-летніх дзяцей, пераважна дяўчат, ламаючы пры гэтым закон, які рашуча забараняе эксплёатаваць працу дзяцей да 15 гадоў... Гэтая агідная эксплёатацыя раскрылася тады, калі ў сакавіку выбухнула забастоўка на гэтых фабрыках... А пасьля—ну, пасьля забастоўкі ўсё ізноў пайшло гладка—на ўсе 200 мільёнаў, „чэсна вапрацаваных“ прамыслоўцамі на крывавай працы малалетніх дзяўчынак...

Сэнсацыі, чуткі, плёткі, скандалы—ў справе ген. Загурскага.

Газэта „А. В. С.“ (ёсьць і такая ў Польшчы, дый—трэба думаць — граматная, бо-ж пэўна—„абэцадла“ ведае...) піша, што сьледчая ўлада адмовілася даць ей надрукаваць тэкст „гончых лістаў“, якія быццам урад разаслаў у-ва ўсё канцы — дзеля шуканьня прапаўшага бяз весьці (бож выпушчанага вайсковым канвоем...) генарала Загурскага. Сьледчая ўлада заявіла, што гэтыя „гончыя лісты“—сэкрэтныя...

Слушна дзівіцца з гэтае прычыны ўся прэса, а „Роботнік“ піша, што „першы раз чуем“, што гончыя лісты могуць быць „сэкрэтныя“...

Да якой дэмаралізацыі дайшло ўжо ў Польшчы ў сувязі з справай прапаўшага генарала, відаць з таго, што „Рэчпаспалітая“ (орган Хадэцыі) папярэдзіла ў нядзельным нумары—аб тым, каб ня верылі новай „штучцы“, якую быццам маюць зрабіць „кіруючыя санацыйныя колы“. — Быццам яны маюць... офабрыкаваць тэлеграму з Бразыліі, куды быццам прыехаў ген. Загурскі. А тэлеграму гэтую быццам будзе загадана даць мясцоваму агенту аднаму з польскіх тэлеграфных агенцтваў...

„Роботнік“ піша, што „Газ. Варшавска“ была сканфіскавана за перадрук яго артыкулу, які напярэдадні быў ужо перадрукаваны —бяскарна — „Варшавянкай“... Відаць, справа—ў тым, што эндэцкая газэта ўлажыла ў перадрук—больш злосьці паміж радкоў.

У апошні мамэнт газэты паведамляюць, што пачалося ўрэшце — цераз тры тыдні! — сьледзтва ў справе прапажы ген. Загурскага. Зроблены дапросы ў Вільні і на чыгунцы Вільня-Варшава.

28 канфіскатаў газэт за 28 дзён.

Газэты падлічылі, што толькі ў адной Варшаве ўлады зрабілі ад 1 па 28 жніўня— 28 канфіскацыяў, ці—па адной абавязкова ў дзень.—Усе—амаль ня выключна за артыкулы ў справе „цудоўнага парваньня жыўцом на неба“ ген. Загурскага...

Недарма-ж ужо навет фашыстаўскія органы прэсы паднялі пытаньне аб тым, ці істнуе яшчэ „свабода слова і друку“ ў Польшчы?! Заклапаціліся аб „свабодзе“, калі пачалі біць па іх...

СУСЬВЕТНАЯ ГАСПАДАРКА.

З гаспадарчай статыстыкі СССР.

Уся буржуазная прэса Захаду аж захоплівалася, прадбачучы поўны гаспадарчы крах СССР у выніку разрыву з Англіяй. Паглядзім аднак-жа на цікаўныя лічбы, толькі што апублікаваныя ў радавай прэсе.

„Экономическая Жизнь“ друкуе даклад ведамага радавага эканаміста Каўфмана, зроблены ім на пасэджаньні Камісарыяту Працы, — у справе гаспадарчага палажэньня СССР, а перадусім — палажэньня яго заграчічнага гандлю.

Вось, якія цікаўныя лічбы падаў дакладчык.

У ліпні сёлетняга году вываз дайшоў да сумы 55 6 мільён. рублёў — пад той час, як у ліпні леташняга году вываз даў толькі 45 6 міл. руб., а ў чэрвені таго году—толькі 42,8 мільён. руб. — Дык ясна, што замест „катастрофы“ з прычыны зачыненьня „найважнейшага — англійскага рынку“ — маем вельмі значную паправу, бо больш, як на 22 прац... Лічбу вывазу направіла значнае павялічэньне экспорту масла, яек і інш. Значна—бо-ж аж на 63 прац.—павялічыўся навет вываз прадуктаў прамысловых — лесу ды нафты.

Прывоз у СССР у ліпні сёлетняга году быў 52,8 мільён. руб., а ў чэрвені с. г. дасягаў аж 73,6 мільён. руб.; у ліпні леташняга году быў 49,5 міліён. руб. Раўнуючы з леташнім годам, зьменшыўся прывоз паўфабрыкатаў, тавараў сельска-гаспадарчых і прадметаў першай патрэбы, якія, відаць, край вырабляе для сябе сам.

З гэтага ўсяго прыраўнаньня выходзіць, што гарговы баланс СССР—дадатні і актыўны, бо дае ў ліпні перавышку вывазу над увозам на 2,8 мільён. руб., а ў ліпні леташняга году баланс быў некарысны, пасыўны: надзышка ўвозу над вывазам была аж 3,9 мільён. руб., у чэрвені-ж таго-ж году заграчічны гандаль даў недахоп (пасыўны баланс) аж на 30,8 мільён. руб.

З гэтага ясна, што, калі за першы месяц страта англійскага рынку блага адбілася на замежным гандлі СССР, дык некарысныя ўплывы разрыву з Англіяй ужо спынены: знойдзены новыя рынкі, ня горшыя, відаць, за англійскія. А хто страціў на ўсім гэтым, ведае найлепш англійскі фабрыкант ды спажывец...

Цікаўныя лічбы з гаспадарчага жыцьця Амэрыкі.

Гаспадарчыя ўлады Злучаных Штатаў маюць добры звычай выдаваць пэрыядычна папулярныя кніжкі, у якіх зьмяшчаюцца галоўныя лічбы й факты з гаспадарчага жыцьця краю. Кніжкі гэтыя апрацаваны ў форме пытаньняў і адказаў, што робіць вельмі простай ды даступнай для шырокіх масаў народу веду аб гэтай найважнейшай галіне сучаснага жыцьця.

Падамо некаторыя найважнейшыя лічбы з апошняга „квартальніка“.

1. **Пытаньне:** якая агульная сума заграчічнага гандлю Штатаў?

Адказ: у 1926 г. агульная сума ўвозу ды вывазу Амэрыкі была 9 мільярдаў 239 мільён. даляраў.

2. **Пытаньне:** ці вывозімо гэтулькі, як увозімо?

Адказ: ад 1893 г. вываз стала перавышае ўвоз (гэта-ж значыць: гандаль ідзе на карысьць краю, павялічаючы ў ім капіталы).

3. **Пытаньне:** што зьяўляецца галоўным таварам вывазу?

Адказ: сушоная бавоўна. У 1926 г. вартасьць вывезенай бавоўны была 814 міліёнаў даляраў, ці 12 прац. усяго вывазу.

4. **Пытаньне:** якіх фабрычных вырабаў вывозімо найбольш?

Адказ: самаходаў. У 1926 г. — аж на 320 мільён. дал.

5. **Пытаньне:** якая частка сьвету найбольш вывозіць з Амэрыкі да сябе?

Адказ: — Эўропа, бо аж 48 прац. усяго амэрыканскага вывазу.

6. **Пытаньне:** які галоўны прадмет увозу ў Амэрыку?

Адказ: сыры каўчук (гума) — ў 1926 г. на суму 505 міл. даляр.

З далейшых адказаў відаць, што заграчічны гандаль Амэрыкі павялічыўся пасьля вайны амаль не ў паўтара раза: вываз — на 46 прац., увоз — на 48 прац., што гатовых фабрыкатаў Амэрыка вывозіць 42 прац. ўсяго вывазу, а сырых прадуктаў жыўнасьці — толькі 7 (—гэта-ж вельмі карысна для краю, які разьвівае сваю прамысловасьць, прадаючы пераважна гатовы прадукт і ўложаную ў яго працу, ды спажываючы сам сваю жыўнасьць); што галоўны рынак для Амэрыканскіх самаходаў—гэта Аўстралія.. І г. д...

Было-б вельмі пажадана, каб і ў нас рабілася нешта падобнае дзеля папулярызацыі (распаўсюджваньня ў народзе) фактаў ды лічбаў аб гаспадарчым стане краю. Нажаль, толькі вось нечым пахваліцца...

Добрая навука.

(Пісьмо з Аргэнтыны).

Аргэнтынскія патрыёты, шчыра кахаючыя свой „дэмакратычны лад“, ніколі ня цікавіліся тым, што аргэнтынская паліцыя так жорстка распраўлялася з рабочымі, якія асьмеліваліся стаяць за свае правы, або пратэставаць.

У гісторыі аргэнтынскага пралетарыяту будзе запісана вялікімі залатымі літарамі аб тэй вялікай трагэдыі, якую ён перажыў на шляху змаганьня за сваю лепшую будучыню. Асабліва вызначыліся студнёвы трагічны тыдзень 1919 г., „усьміреньне“ Патагоніі і іншыя падзеі.

Аргэнтынскія патрыёты заставаліся заўсёды сьляпымі, глухімі і нямымі на тое, што аргэнтынская паліцыя сілай разганяла работніцкія мітынгі і маніфэстацыі. Ажно ўрэшце прышоў час і на патрыётаў, — прышоў час, калі і ім самім прышлося адчуць на сваіх уласных сьпінах паліцэйскую шаблю і цяжкія капыты паліцэйскіх коні.

А сталася гэта такім чынам:

Аргэнтынскі ўрад, жадаючы выкінуць з свайго нацыянальнага гімну словы, абражаючыя гішпанскую плютократыю (багачы) звароты (гімн быў напісаны ў часе барацьбы за незалежнасьць ад гішпанскага ярма) — пастанавілі зьмяніць словы і музыку нацыянальнага гімну, апіраючыся на тое, што ў старым выглядзе гімн цяжкі дзеля выканьньня. Зьмены ў гімне былі зроблены без паразуменьня з народам і бяз згоды з парлямантам (соймам). Проста быў выданы ўладай дэкрэт, што надалей мае выпаўняцца сьпеў і музыка нацыянальнага гімну на новы лад. Гэта выклікала вялікае абурэньне з боку патрыётаў. Павялася сыстэматычная прапаганда супроць ураду, які, быццам, нарушыў народныя традыцыі і канстытуцыю. Было наладжана шмат мітынгаў, маніфэстацыяў і іншага віду пратэстаў.

Урэшце ў дзень 9 ліпня, у дзень нацыянальных сьвяткаваньняў маніфэстацыі ўсіліліся і навет была зроблена спроба ўварвацца ў урадавы будынак, але маніфэстанты былі разагнаны паліцыяй. Ахвяр ня было, за вынятком некалькіх арыштаваных.

Вечарам 9-га ліпня ў дзень нацыянальных сьвяткаваньняў патрыётычнае пачуцьцё яшчэ больш разгарэлася. Вялікі натоўп маніфэстантаў з нацыянальнымі штандарамі і з пяяньнем нацыянальнага гімну на стары лад, пакіраваўся да ўрадовага будынку, дзе маніфэстанты меліся перадаць праз дэлегатаў пратэст ураду.

Але буржуазнае вока ўлады не драмала... Як толькі маніфэстанты падыйшлі бліжэй да ўрадавага будынку, конная паліцыя ўрэзалася ў сярэдзіну натоўпу, б'ючы шаблямі направа і налева і топчучы коньмі маніфэстантаў з іх нацыянальнымі сьцягамі. Некалькі разоў маніфэстанты прабавалі зноў згрупавацца, але пасьля кожнай спробы былі разганяны паліцыяй.

Так бывае ў свабодным, дэмакратычным краі.

Для нас, пралетарыяў, ня маючых ні бацькаўшчыны, ні нацыянальнага сьцягу — гэты выпадак ня мае вялікага значэньня, бо калі толькі паліцыя будзе распраўляцца з работнікамі так, як яна расправілася з патрыётамі, дык мы пэўны, што тыя самыя патрыёты будуць па баку паліцыі, а не па баку работнікаў. Навет больш, яны будуць рады, што маюць такіх верных нявольнікаў, што так шчыра абараняюць іх інтарэсы.

А ўсё ж такі выпадак тут апісаны быў добрай навукай для аргэнтынскіх патрыётаў.

П. Алейнік.

18/VII—1927 г. Буэнос-Айрэс.

Заграніцай.

Польска-літоўскія перагаворы ў Жэнэве.

Літоўская газэта „Rytas“ даведалася, што перагаворы ў справе польска-літоўскага паразуменьня маюць запраўды распачацца ў Жэнэве—у часе Агульнага Збору Лігі Народаў. Быццам у склад дэлегацыяў абедзьвюх дзяржаваў назначаны асобы, асабліва добра ведаючыя польска-літоўскія справы.

Афіцыяльнае паведамленьне Радавага Ураду.

„Известия“ друкуюць афіцыяльны камунікат Радавага Ураду—аб ліквідацыі — шляхам перагавораў з польскім урадам—канфлікту, які ўзьняўся ў сувязі з забойствам пасла Войкова. Усе спрэчныя пункты ўладжаны, і Наркоміндел (народны камісарыят заграчічных спраў) прызнае ўсю справу зьліквідаванай. Дзеля гэтага камунікат заяўляе, што ў бліжэйшыя дні будуць узноўлены перагаворы з Польшчай у справе палітычнага і гаспадарчага трактату.

У справе адносінаў між Амэрыкай і СССР.

Газэты паведамілі, што ў Амэрыку выехала з Масквы дэлегацыя Радавай Рады Народнай Гаспадаркі—на чале з старшынёй Рады докт. Гурэвічам. У склад дэлегацыі ўваходзяць спэцыялісты па нафтавай і вугальнай прамысловасьці СССР.

Навет вельмі крытычныя да СССР ў апошні мамэнт (з прычыны чарговага флірту з Англіяй — перад сэсіяй Лігі Народаў!) нямецкія дэмакратычныя газэты прызнаюць, што паразуменьне між Амэрыкай і СССР прадстаўляе значны пасьпех палітыкі Радаў, дый што Амэрыка, „вырашаючы ў канфлікце з Англіяй свае ўласныя задачы, можа памагчы СССР вырашыць і свае“...

Англійскія шпіёны ў СССР.

У Ленінградзе арыштаваны 26 асоб, абвінавачаных у шпіёнстве на карысьць Англіі. Суд распачнецца 2-га верасьня.

Кангрэс II Інтэрнацыяналу.

11—13 верасьня — адначасна з сэсіяй Лігі Народаў — мае сабрацца канфэрэнцыя Выканаўчага Камітэту II Інтэрнацыяналу (сацыялістычнага). Канфэрэнцыя гэта мае перадусім абгаварываць справу скліканьня міжнароднага Кангрэсу II Інтэрнацыяналу ў 1928 годзе. Апрача таго на павестцы Канфэрэнцыі стаяць — справы разбраеньня і яшчэ шмат іншых.

Цікаўна: хто паедзе на гэтую канфэрэнцыю з ППС? Ці ізноў той самы п. Недзялковскі, які так добра „інфармаваў“ II Інтэрнацыянал на папярэдняй канфэрэнцыі — аб тым, што робіцца ў Польшчы...

Канфэрэнцыя міністраў Латвіі і Эстоніі.

29-га жніўня мелі спаткацца ў Рызе міністры заграчічных спраў Латвіі і Эстоніі — у справе заключэньня ўмовы аб „мытнай уніі“ (аб'яднаньні) між абыдвума краямі. Быццам умяшацельства дыпляматаў у гэтую гаспадарчую справу выклікана тым, што Эстонія незадаволена ўступкамі, якія Латвійскі ўрад зрабіў СССР—у гаспадарчым трактаце з Радамі. Быццам гэтым утрудняецца для Эстоніі не амаль ужо не налажанае канчальна паразуменьне ў справе гэтай уніі.

Як ведама, латвійскі ўрад зусім ужо вызваліўся з пад англійскага палітычнага націску, але эстонскі — дык яшчэ не. Вось, трэба думаць, адкуль вее Эстоніі „проціравы вецер“...

Чаму лёрд Сэсіль выйшаў з Лігі Народаў?

Газэты высьнілі, што лёрд Сэсіль выйшаў з складу англійскай дэлегацыі ў Лізе Народаў—затым, што рашуча разыйшоўся з Чэмбэрленам у палітыцы адносна да Нямеччыны. Лёрд Сэсіль — прыхільнік рашучых уступак Нямеччыне, Чэмбэрлен — выбраў Францыю, якой зрабіў уступкі ў справе акупацыі-коштам Нямеччыны.

Нямецкія газэты дадаюць, што—пасьля адстаўкі л. Сэсіля — у Чэмбэрлена будуць разьвязаны рукі і ў ягонай палітыцы на ўсходзе Эўропы, якая будзе больш узгоднена з францускай, а значыць і — польскай, ды таксама будзе ісьці—проці нямецкай... Разыходзіліся Сэсіль з Чэмбэрленам і ў справе разбраеньня.

Паразуменьне між Англіяй і Францыяй у справе акупацыі.

Англійскае міністэрства загран. спраў пацьвярджае вестку, што між Англіяй і Францыяй дайшло да паразуменьня ў справе зьмяншэньня акупацыйных войск у Надрэніі (ў Нямеччыне). Лічба акупацыйных войск зьмяншаецца да 60.000. Францускія войскі будуць зьменшаны на 8.000 жаўнераў, англійскія і бэльгійскія разам—на 3.000. Ці Нямеччына будзе здаволена гэткай „уступкай“,—вельмі сумліўна.

Цікаўна, што англійскі ўрад доўга націскаў на францускі, трэбуючы большага зьмяншэньня, а перадусім абураючыся на той матыў, які высоўваў францускі ўрад, што акупацыя Надрэніі мае гарантаваць нятыкальнасьць заходніх граніцаў Польшчы... Англійскі ўрад рашуча і выразна заявіў, што—паводле точнага сэнсу Вэрсальскага Трактату і паразуменьня ў Лёкарно — акупацыя мае гарантаваць толькі і выключна сплату Нямеччынай адшкадаваньняў, але ніколі не граніцы Польшчы... Нямецкі ўрад, як ведама, ідзе значна далей, заяўляючы, што ад часу Лёкарно і ўваходу Нямеччыны ў склад Лігі Народаў — акупацыя ня мае ніякага праўна-палітычнага сэнсу, ды ёсьць маральнай абразай для Нямеччыны, як „раўнапраўнага сябра Лігі“...

Высылка „непажаданых чужаземцаў“ з Францыі.

Французскі ўрад пастанавіў зрабіць масавую высылку з краю ўсіх „непажаданых чужаземцаў“, якія, як нібыто высьнілася, ігралі галоўную ролю ў адбыўшыхся разрухах—у сувязі з масавымі пратэстамі францускіх грамадзян проці казьні Сакко і Ванцэтті.

Чаму-ж запраўды не скарыстаць з добрай аказіі?!..

Хатняя вайна ў Кітаі.

Лёнданскія крыніцы паведамілі, што Чанг-Тсо-Лін ужо настолькі пачуў сабе панам палажэньня ў Кітаі, што мае абвясьціць сябе—...„выбраным“ прэзыдэнтам усей Кітайскай Рэспублікі.

Японскі тэрор і разрухі ў Манчжурыі.

У сувязі з яўным ужо панаваньнем у Манчжурыі Японіі, якая лічыць гэты край амаль не сваім, у цэлым радзе местаў выбухлі забастоўкі ды паўстаньні работнікаў. Паўстаньні скіраваны проці японцаў, якіх у часе разрухаў шмат пазабівана.

Трэба думаць, што гэтыя разрухі ўмысна справакаваны японскімі ўладамі, каб аблягчыць расправу, а дзеля таго — увясьці ў край больш азброенай сілы...

Цікаўныя рэзультаты выбараў у Клайпэдскі Сойм.

Нямецкае агенцтва апублікавала рэзультаты выбараў у Клайпэдкі аўтаномны Сойм. Вялізарную большасьць атрымалі, зразумела-ж нямецкія партыі, а іменна: нацыяналісты — 8.538 галасоў, камуністы — 2.291, сацыял-дэмакраты — 1.349, сялянская партыя— 740. Усе літоўскія партыі разам — толькі 1.230 галасоў.

Ці-ж хто сумляваўся калі, што Клайпэды — амаль ня чыста нямецкі абшар?!

ІНСТРУКЦЫЯ

ЯК ДАМАГАЦЦА УРАДОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

на падставе ўставу ад 31./VII. 1924 г. і распараджэньня Мініст. Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы ад 7./I. 1925 г.

Закон аб арганізацыі беларуск. школьніцтва

з дня 31./I. 1924 г. ўхвалены Соймам 9./VII. 1924 г. (Выпіска).

Арт. 3. У пачаткавых урадавых школах, якія находзяцца ў гмінах, дзе ёсьць 25 проц. насяленьня беларусаў, на ўрадова сцьверджанае жаданьне бацькоў 40 дзяцей — беларускай народнасьці, якія належаць да аднаго школьнага вокругу, забясьпечана ім будзе навука ў роднай матчынай мове.

Калі ў пададзеным школьным вокругу няма 40 дзяцей, бацькі якіх зажадалі-б навукі ў роднай беларускай мове, выкладовай мовай у школе ёсьць мова ўрадавая (польская). Калі-ж у дадзеным школьным вокрузе побач з бацькамі, якія жадаюць для сваіх дзяцей навукі ў мове беларускай, ёсьць ня менш прынамсі як 20 дзяцей, бацькі якіх жадаюць навукі ў мове ўрадовай, выкладаньне тады вядзецца ў дзьвюх мовах з тым, што палавіна лекцыяў вызначаецца на навуку ў мове беларускай; калі-ж у дадзеным вокрузе няма 20 дзяцей, бацькі якіх жадаюць навукі ў мове ўрадовай, — мовай выкладовай ёсьць мова беларуская.

Істнуючыя ў адным вокрузе паасобныя школы з мовай выкладовай польскай і з мовай выкладовай беларускай будуць па магчымасьці злучаны ў адну школу супольную — дзьвюх-моўную.

Арт. 4. У школах пачаткавых 1, 2 і 3 клясовых, так прыватных, як і ўрадовых, з мовай выкладовай няпольскаю, абавязкава ёсьць навучаньне мовы ўрадовае, каб запэўніць веду гэтае мовы ў слове і пісьме, патрэбную для мэтаў практычных.

У школах пачаткавых 4, 5, 6 і 7 клясовых, так прыватных, як і ўрадовых, з моваю выкладоваю няпольскаю, абавязкава вядзецца папольску навучаньне мовы ўрадовае, польскай гісторыі і навукі аб сучаснай Польшчы, так каб была запоўнена веда іх дзеля пераходу вучняў у школы сярэднія агульна-адукацыйныя з мовай выкладовай польскай, або дзьвёх-моўныя.

Выясьненьне 3 арт.

1) Дзе мусіць быць беларуская школа.

Згодна з арт. 3 закону аб беларускіх школах з 31.VII 1924 г., беларуская ўрадавая школа павінна быць адчынена ўладаю там, дзе насяленьня ёсьць ня менш 25% (25 процантаў) беларусаў і дзе гэтага жадаюць бацькі ня менш, як 40 дзяцей у школьным веку.

Гэта адносіцца да Навагрудзка ваяводзтва (паветы: Валожынскі, Стаўпецкі, Лідзкі, Навагрудзкі, Нясьвіжскі і Слонімскі), Палескага ваяводзтва (паветы: Лунінецкі, Пінскі, Касаўскі, Пружанскі, Драгічынскі, Кобрынскі, Столінскі і Берасьцейскі). Віленскага вокругу (паветы: Сьвянцянскі, Дзісьненскі, Пастаўскі, Маладэчанскі, Вялейскі Ашмянскі, Троцка-Віленскі і Браслаўскі) і з Беластоцкага ваяводзтва (паветы: Горадзенскі і Ваўкавыскі).

> Увага: Закон гэты ня мае сілы ў паветах: Беластоцкім, Бельскім і Сакольскім.

2) Як урадова сцьвярджаецца жаданьне бацькоў.

Кожын бацька, які жадае, каб яго дзіця вучылася ў беларускай школе, або матка (калі бацька памёр ці не выпаўняе бацькоўскай улады), або праўны апякун (калі бацька й матка ня жывуць ці не выпаўняюць бацькоўскай улады) падае свайму павятоваму Школьнаму Інспэктару асобна ад сябе дэклярацыю з уласнаручным подпісам, засьведчаным гмінаю, Старостам,Міравым Судзьдзёю ці Натарысам (Форма дэклярацыі глядзі ніжэй).

3) У якім выпадку адчыніцца беларуская ўрадовая школа.

Калі ў школьным вокрузе (гэта значыць у адной вялікай вёсцы ці некалькіх малых вёсках) няма ніякай школы, і бацькі пададуць Школьнаму Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 40 вучняў, што жадаюць вучыць сваіх дзяцей у беларускай школе, а адначасна зусім ня знойдзецца бацькоў, ці іх будзе меньш, як на 20 дзяцей, што жадаюць вучыць сваіх дзяцей у польскай школе, то ўлада мусіць адчыніць у гэтым школьным вокрузе беларускую школу.

4) У якім выпадку ўрадавая польская школаператворыцца ў беларускую.

Калі ў вёсцы ўжо істнуе польская ўрадовая школа, а бацькі пададуць Школьнаму Інспэктару дэклярацыяў ня менш як 20-х вучняў, што жадаюць вучыць сваіх дзяцей у беларускай школе, то ўлада ў гэтай вёсцы мусіць ператварыць польскую школу ў беларускую.

5) У якіх выпадках можа быць дзьвёх-моўная (двуязычная) школа (польска-беларуская), у якой палова гадзін навукі выкладаюцца папольску, а палавіна пабеларуску.

1) Калі ў тэй ці іншай вёсцы ўжо істнуе польская школа і ў гэтым школьным вокрузе бацькі пададуць Школьнаму Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 40 вучняў, што жадаюць, каб у гэтай школе навукі выкладаліся ў беларускай мове, а адначасна знойдуцца бацькі, якія пададуць Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 20 вучняў, што жадаюць, каб іх дзеці вучыліся толькі папольску, то школа зробіцца дзьвёх-моўнаю.

2) Калі ў школьным вокрузе ўжо істнуе беларуская школа, а знойдуцца бацькі, якія пададуць Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 20 вучняў, каб у школе навукі выкладаліся выключна ў польскай мове, то школа пераробіцца ў дзьвёх-моўную, г. зн. польска-беларускую.

3) Калі ў школьным вокрузе няма ніякай урадовай школы, і бацькі пададуць Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 40 вучняў, што жадаюць, каб была адчынена беларуская школа, а адначасна знойдуцца бацькі, якія пададуць Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 20 вучняў, што жадаюць, каб была адчынена польская школа, — то ўлада мусіць адчыніць дзьвёх-моўную школу, г. з. польска-беларускую.

6) У якім выпадку можа адчыніцца чыста польская школа.

Калі ўлада адчыняе ўрадовую школу ў такой вёсцы, дзе няма яшчэ ніякай школы або ёсьць прыватная, а бацькі не парупяцца, каб адчынілася беларуская школа й не пададуць аб гэтым Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 40 вучняў, то адчыніцца польская школа.

7) У якім выпадку можа застацца і надалей уже істнуючая польская школа.

Калі ў школьным вокрузе ўжо істнуе польская школа, і ня знойдуцца бацькі, якія падалі б Інспэктару дэклярацыяў ня менш, як на 40 вучняў, каб навука ў гэтай школе выкладалася пабеларуску, то ў гэтым вокрузе застанецца польская школа і надалей.

Выясьненьне 4 арт.

Як і дзеля чаго павінна выкладацца польская мова ў беларускіх школах.

1) У беларускіх 1, 2-х і 3-х аддзяловых школах польская мова выкладаецца, як прадмет, каб вучні, скончыўшыя беларускую школу, маглі карыстацца з польскай мовы ў слове і пісьме дзеля практычных мэтаў, прыкладам: чытаць, пісаць і гаварыць.

2) У чыста беларускіх 4, 5, 6 і 7 аддзяловых школах польская мова выкладаецца, як прадмет, а таксама выкладаюцца папольску гісторыя й геаграфія Польшчы, каб вучні былі падгатаваны для пераходу ў беларускія або польскія сярэднія школы, прыкладам: гімназіі, вучыцельскія сэмінарыі і іншыя.

Выясьненьне Распараджэньня Мінст. Рэліг. Вызнаньняў і Публічнай Асьветы

ад 7./I. 1925 г. ў справе ўставу аб арганізацыі беларуск. школьн. ад 31./VII. 1924 г.

(*Да артыкулаў 3 і 4 ўставу*).

§ 1. Беларускія ўрадовыя школы могуць адчыняцца ў Віленскім, Навагрудзкім, Палескім ваяводзтвах, у Горадзенскім і Ваўкавыскім паветах Беластоцкага ваяводзтва.

§ 2. Народная школа ёсьць даступна для дзяцей усіх нацыянальнасьцяў. Кожная вёска ці хутар належыць да пэўнага школьнага вокругу (абводу). У кожным такім школьным вокрузе павінна быць адна публічная ўрадовая школа.

§ 3. „Publiczne szkoły powszechne“—гэта значыць дзяржаўныя, у якія могуць паступаць дзеці ўсіх нацыянальнасьцяў дадзенага школьнага вокругу.

§ 4. У ваяводзтвах Віленскім, Навагрудзкім, Палескім, а таксама Горадзенскім і Ваўкавыскім паветах Беластоцкага ваяводзтва могуць быць школы беларускія або польскія, або польска-беларускія.

§ 5. Права на жаданьне бацькоў вымагаць навучаньня сваіх дзяцей у роднай беларускай мове маюць жыхары тэй гміны, у якой, згодна апошняй перапісі ў 1921 г., ёсьць ня менш як 25% беларусаў сярод агульнага ліку насельнікаў.

§ 6. Публічная народная школа павінна быць адчынена там, дзе вызначыць дэкрэт аб арганізацыі школы.

§ 7.-b. Школьны век дзіцяці лічыцца ад 1 верасьня (сентября) таго каляндарнага году, у якім дзіця скончыла ці мае скончыць 7 гадоў і да канца таго школьнага году (30 чэрвеня), у якім дзіця канчае 14 гадоў жыцьця, гэта значыць ад 7 год без 4 месяцаў да 14 гадоў і 4 месяцаў.

§ 8. Права выступаць з жаданьнем навучаньня сваіх дзяцей школьнага веку маюць: 1) бацька; 2) матка, калі бацька памёр ці не выпаўняе бацькаўскай улады; калі няма бацькі і маткі, то праўны апякун.

Аб жаданьні навучаньня дзяцей у беларускай мове бацькі ці апякуны падаюць дэклярацыі Школьнаму Інспэктару свайго павету.

На дэклярацыі ўласнаручны подпіс павінен быць завераны гмінаю, ці Міравым Судзьдзёю, ці Натарысам, ці старостам.

> УВАГА: Калі бацька ці матка, ці апякун няпісьменныя, то за яго падпісваецца хто іншы, і сцьвярджаецца ўжо гэты подпіс.

Калі Школьнаму Інспэктару бацькі з ягога-колечы школьнага вокругу пададуць дэклярацыі ня менш як на 40 дзяцей аб тым, што хочуць вучыць сваіх дзяцей у беларускай мове, то Інспэктар наводзіць спраўкі:

1, ці ёсьць у гміне 25% (дваццаць пяць процантаў) беларусаў.

2, ці бацька, або матка, або апякун жывуць з дзяцьмі ў дадзеным школьным вокрузе.

3, ці дзеці, на якія пададзены дэклярацыі, жывы, і ці адпавядае іх век школьнаму.

4, ці апякун ёсьць праўны.

§ 9. Выкладовая мова з польскай на беларускую можа быць замененa толькі ў пачатку школьнага году.

Дэклярацыі можна падаваць Інспэктару ў працягу ўсяго школьнага году, але будуць мець сілу на наступны школьны год толькі тыя, якія будуць складзены да 31 сьнежня (декабря) папярэдняга школьнага году.

§ 10. Аб тым, што бацькі ня менш як на 40 дзяцей падалі дэклярацыі, каб іх дзяцей вучылі ў беларускай мове, Школьны Інспэктар да 1 лютага (февраля) паведамляе аб гэтым люднасьць таго школьнага вокругу, ці ня будзе рэшта бацькоў прасіць Інспэктара, каб іх дзяцей вучылі ў польскай мове.

Аб гэтым абвестка Інспэктара вывешваецца ў гміне або ў вёсцы на відным мейсцы, толькі не на школьным будынку.

Дэклярацыі аб жаданьні навучаньня дзяцей у польскай мове будуць мець сілу толькі тыя, якія будуць пададзены Інспэктару да 30 красавіка (апрэля).

§ 11. Калі адна, ці некалькі вёсак не ўваходзяць у той ці іншы школьны вокруг, то можа быць часова і прыблізна вызначаны школьны вокруг.

§ 12. Разгледзіўшы дэклярацыі, Школьны інспэктар не пазьней 31 траўня (мая) робіць свае заключэньне і з усімі матар'яламі оправу перадае Куратару. На падставе дадзеных Інспэктарам прапазіцыяў, Куратар у працягу месяца рашае аб мове навучаньня ў тэй ці іншай школе і аб сваім рашэньні праз абвестку паведамляе заінтарасаваную людносьць. Апроч таго, аб сваім рашэньні куратар паведамляе аднаго з тых бацькоў, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у беларускай мове і аднаго з тых, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у польскай мове.

Пастанову Куратара бацькі могуць абжалаваць да Міністра Асьветы ў працягу 14 дзен. з дня паведамленьня праз абвестку.

§ 13. Істнуючыя ў данны момант народныя школы з выкладовай мовай беларускай або польскай захоўваюць гэту мову й далей.

Зьмена выкладовай мовы ў гэтых школах можа зьдзейсьніцца толькі па жаданьню бацькоў згодна §§ 8, 9, 10, 11 і 12.

Калі-ж бацькі ад 20 вучняў пажадаюць, каб у беларускай школе навукі выкладаліся папольску, а рэшта дзяцей будзе ня менш як 40, то зараз-жа школа робіцца дзьвохмоўнаю, г. з. польска-беларускаю; а калі з рэшты дзяцей не набярэцца 40, то выкладовая мова ў гэтай школе будзе польская.

§ 14. Істнуючыя ў даны момант беларускія публічныя школы, якія не адпавядаюць уставе і § 4 гэтага распараджэньня праз Кураторыум і Міністра Асьветы паступова будуць да гэтай уставы і распараджэньня дапасаваны.

§ 15. Аб злучэньні аддзельных публічных школ з выкладовай моваю толькі беларускаю пастанаўляе куратар.

§ 16. Праграмы ўсіх прадметаў публічных школаў дзьвёх-моўных, а таксама праграмы польскай мовы і гісторыі Польшчы для чыста беларускіх школаў будуць вызначаны асобным распараджэньнем.

Распараджэньне Міністра Унутраных Спраў ад 12 лютага 1925 года.

Каб войты сцьвярджалі подпісы на дэклярацыях аб жаданьні беларускай Школы ды пры тым зусім бясплатна.

ПРАКТЫЧНЫЯ РАДЫ.

А. Што павінен зрабіць кожны бацька беларус ці матка, ці апякун, якія маюць дзяцей у школьным узросьце.

1. Кожны бацька, матка ці апякун павінны дбаць, каб іх дзеці вучыліся ў сваей роднай беларускай школе.

2. Кожны беларус павінен скарыстаць свае права дамагацца беларускай школы для сваіх дзяцей.

3. Кожны бацька, матка ці апякун павінны напісаць дэклярацыю аб тым, што жадаюць, каб іх дзеці вучыліся ў роднай беларускай мове, абавязкава пайсьці ў гміну, заверыць там свой подпіс і праз паўнамоцніка пад расьпіску гэту дэклярацыю здаць Школьнаму Інспэктару да 31-га сьнежня гэтага 1927 г.

> Увага: Заверыць дэклярацыю можа, апроч гміны, яшчэ Міравы Судзьдзя, Натарыус, Староства. Заверка на дэклярацыі подпісу солтысам, ці сьвяшчэньнікам, ці ксяндзом, ці вучыцелем, ці кім іншым ня будзе мець ніякое сілы, і дэклярацыя забракуецца.

4. Дэклярацыю трэба падпісваць у прысутнасьці войта.

5. Калі бацька, ці матка, ці апякун няпісьменны, то трэба папрасіць пісьменнага чалавека, каб у прысутнасьці войта расьпісаўся, як за няпісьменнага бацьку, і войт заверыць ужо гэты подпіс.

> Увага: Калі ёсьць няпісьмен. бацька, а матка пісьменная, то матка, ці дзіця ня можа падпісвацца на дэклярацыі за бацьку: трэба, каб падпісаўся хто іншы і дарослы.

6. Войт ня мае права адмовіцца ад заверкі подпісу, бо нарушыў-бы загад Міністра Унутраных Спраў ад 12-га лютага 1925 г.

> Увага: 1) Калі войт адмовіцца пасьведчыць подпіс, то зараз-жа трэба аб гэтым паведаміць Галоўную Управу.
>
> 2) Заверкі подпісаў у гміне ня трэба адкладваць на апошнія дні, бо войт ня ўсьпее пасьведчыць усіх подпісаў да 31 га сьнежня.

7. Толькі тады адчыніцца беларуская ўрадавая школа, або ператворыцца істнуючая польская школа ў беларускую, калі бацькі з аднаго школьнага вокругу пададуць Школьнаму Інспэктару як можна больш дэклярацыяў, а прынамсі ня менш, як на 40 вучн., што хочуць, каб іх дзеці вучыліся ў беларускай мове.

8. Калі Куратар на дэклярацыі не адчыніць беларускай школы, або не ператворыць істнуючай польскай школы ў беларускую, то бацькі павінны скардзіцца Міністру Асьветы.

Б. Што павінен зрабіць паўнамоцнік, якога бацькі выбяруць складаць Школьнаму Інспэктару дэклярацыі.

1. Запісаць на асобным лісьце імёны і прозьвішчы бацькоў і апякуноў, імёны іх дзяцей, напісаць паперу да Школьнага Інспэктара, асабіста па сьпіску здаць у Інспэктарыят дэклярацыі да 31-га сьнежня (декабря), узяць ад Інспэктарыята пасьвідчаньне на сьпіску бацькоў, сьпіс з пасьвідчаньнем хаваць у сябе, а копію прыслаць у Галоўную Управу ТБШ (Вільня, вул. Сьв.-Ганны № 2).

В. У якой мове пішацца і запаўняецца форма дэклярацыі.

1. Дэклярацыю трэба пісаць, або пабеларуску, або папольску. Калі дэклярацыя будзе напісана паруску, то Інспэктар можа забракаваць.

У форме дэклярацыі трэба напісаць: імя і прозьвішча бацькі ці маткі, ці апякуна, назоў вёскі, гміны, павету, імёны дзяцей. Непатрэбныя словы ў дэклярацыі закрэсьліць.

Г. Як павінна дапамагчы наагул беларускае грамадзянства, каб для сваіх дзяцей мець сваю родную беларускую школу.

1. У тым школьным вокрузе (абводзе), дзе няма ніякай школы, беларусы павінны дамагацца, каб была адчынена беларуская школа; а дзе істнуе ўжо польская школа, каб яна ператварылася ў беларускую.

2. Кожны пісьменны, або больш сьвядомы грамадзянін павінны растлумачыць няпісьменнаму бацьку ўставу аб арганізацыі школьніцтва ад 31./VII. 1924 г., а таксама распараджэньні Міністра асьветы ад 7./I. 1925 г., памагчы напісаць дэклярацыю, старацца, каб дэклярацыяў было пададзена як можна больш, сьлядзіць каб дэклярацыі былі завераны гмінаю і паданы Інспэктару да 31-га сьнежня (декабря).

3. Калі хто будзе адмаўляць ці запугваць тых бацькоў, якія на падставе закону і распараджэньня Міністра Асьветы будуць падаваць Інспэктару дэклярацыі, каб іх дзяцей вучылі ў беларускай мове, таго трэба пацягнуць да судовай адказнасьці, як за бэламутства грамадзян.

4) Калі навет ёсьць у вёсцы прыватная беларуская школа—усё-роўна трэба дамагацца ўрадовай беларускай школы.

Д. Форма паперы, якую піша паўнамоцнік і перадае разам з дэклярацыямі Школьнаму Інспэктару.

Пану Школьнаму Інспэктару.

у месце . . . .

Паўнамоцніка жыхароў вёскі . . . .

. . . . . воласьці . . . . . . павету

(прозьвішча і імя) . . . .

ЗАЯВА.

У зьвязку з распараджэньнем Міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы ад 7.I. 1925 г. у справе школьнага ўставу ад 31.VII. 1924 году я, ніжэйпадпісаны паўнамоцнік сялян вёскі . . . . гэтым перасылаю „. . . “ штук дэклярацыяў на „. . . “ дзяцей у справе беларускае выкладовае мовы ў школе ў вёсцы . . . . .

Ад грамадзян вёскі . . . .

№	Імя і прозьвішча бацькі, маткі ці апякуна.	Імёны дзяцей, пададзеных у дэклярацыях.
1		
2		
3		

Подпіс паўнамоцніка . . . . . .

Дня „. . “ . . . . 192 . . г.

Адрэс: пошта . . . .

вёска . . . . . . павет . . . . . .

БАЦЬКІ! падавайце Інспэктару, як можна, больш дэклярацыяў аб навучаньні вашых дзетак у беларускай мове.

Школьны век дзіцяці лічыцца ад 7 гадоў без 4-х месяцаў да 14 гадоў і 4-х месяцаў.

ГРАМАДЗЯНЕ! дамагайцеся аб пэратвараньні польскіх школаў у беларускія.

Формы дэклярацыяў і інструкцыі можна атрымаць:

1) У Галоўнай Управе Т-ва Бел. Школы, Вільня, вул. Сьв.-Ганны № 2.

2) Глыбоцкая Акружная Управа Т-ва Белар. Школы, Ломжынская 56.

3) Навагрудзкая Акружная Упр. Т-ва Бел. Школы, Вялікі Рынак 37.

4) Вялейская Акружная Управа Т-ва Белар. Школы, Слабодка, 50.

5) Мірская Акр. Управа Т-ва Белар. Школы, Міранская вул. 61.

6) Лідзкая Акр. Управа Т-ва Белар. Школы, м. Ліда, Слабодка I, № 38 (А. Макарэвіч).

7) Горадзенская Акр. Управа Т-ва Бел. Школы м. Горадня, вул. Ожэшковай № 8—6.

8) Косаўская Акр. Управа Т-ва Белар. Школы м. Косаў, Марачоўская вул. № 11.

9) Радашкоўскае Т-ва Белар. Школы м. Радашкавічы, Беларуская Гімназія.

10) Клецкае Т-ва Беларуске Школы м. Клецк, Беларуская Гімназія.

11) У-ва ўсіх Гуртках Т-ва Беларускае Школы.

Дэклярацыя.

Я ніжэй надпісаны (ая)...*грамадзянін (ка)*
(імя і прозьвішча)

Польскае Рэчыпаспалітае, беларускае нацыянальнасьці жыхар ______________
(назоў вёскі, места)

воласьці.............................*павету* ______________________ *як бацька *)—маці—*
(назоў воласьці) (назоў павету)

праўны апякун дзіцяці—дзяцей—у школьным веку.

1. ______________ (Імя дзіцяці) *3.* ______________ (Імя дзіцяці)

2. ______________ (Імя дзіцяці) *4.* ______________ (Імя дзіцяці)

на падставе артыкулу з уставу з 31 ліпня 1924 г., зьмяшчаючага некаторыя пастановы аб арганізацыі шкальніцтва (Dz. U. R. P. № 79, poz. 766), жадаю ўвядзеньня ў істнуючую — маючую адкрыцца публічную народную школу ў...***беларускае выкладовае мовы.***
(назоў вёскі, места)

Дня ______________ *192*........*г.* ______________
(уласнаручны подпіс).

Да Школьнага Інспэктара

ў м....
(назоў места)

*) У тэксьце дэклярацыі непатрэбныя словы закрэсьліць.

ХРОНІКА.

Пачатак школьнага году. Гэтымі днямі ў-ва ўсіх школах, а ў тым ліку і ў беларускіх гімназіях, пачынаюцца нармальныя заняткі. У Віленскай Беларускай Гімназіі навука пачынаецца 5 верасьня.

Зацьвярджаньне дырэктара Віл. Белар. Гімназіі. Ня гледзячы на ўсе агідныя інтрыгі і ілжывыя даносы полёнофільска дэфэнзыўнае прэсы, скіраваныя проці найпаважнейшае беларускае гімназіі ў Вільні, ня гледзячы на завярэньні абшарніцкага „Слова“, што ніхто з сучаснага складу вучыцялёў гімназіі ня будзе зацьверджаны на становішчы дырэктара, — улада зацьвярдзіла кандыдатуру вуч. Паўловіча, пададзеную Галоўнай Управай Т-ва Беларускае Школы. Гэтак лятуценьні пана акцызьніка Умястоўскага зьмяніць свой „сьпірытусовы“ фах на пэдагогіку—ня зьдзейсьніліся.

Горш стаіць справа з зацьверджаньнем вучыцялёў, проці якіх адміністрацыя „мае зуб“. Як нас інфармуюць, цэламу раду пэдагогаў, якія ў працягу некалькіх гадоў працавалі ўжо ў Гімназіі, пагражае сёлета забарона далейшае працы ў ёй. Зусім, як у расейскай прыказцы: „не мытьем, так катаньем“, а ўсё-ж хочуць нашы „апякуны“ працы гімназіі ўстаўляць палкі ў колы...

Цікаўна, чым скончыцца распачатая барацьба з Віленскай Беларускай Гімназіяй.

Гожа прыпомніць, што за панаваньня эндэкаў у Віленскім Куратарыюме дырэкцыі Гімназіі адкрыта сулілі і правы, і дзяржаўную дапамогу, абы толькі выбралася з Вільні некуды на правінцыю ды не мазоліла вачэй у „чыста польскай“ Вільні. Паны „санатары“, здаецца, абралі іншую тактыку—дзеля тае ж мэты...

Да арганізацыі Вышэйшае Студыі Беларусазнаўства. Падгатоўка да арганізацыі Вышэйшае Студыі Беларусазнаўства ў Вільні ўжо ідзе. Забясьпечана ўчасьце нашых найпаважнейшых працаўнікоў на ніве беларускае навукі,—з другімі вядуцца перагаворы. Пакуль-што могуць быць сёлета распачаты курсы: царкоўна-славянскае і праславянскае мовы, беларускае мовы, беларускае літаратуры (старадаўнае і новае — два курсы), ды асабліва цікаўны курс філязофіі ў сувязі з філязофскімі кірункамі на Беларусі.

Есьць надзея, што Студыя распачне сваю працу з канцом гэтае восені.

Забастоўка віленскіх краўцоў. Як ведама, у Вільні вельмі многа кравецкіх майстроўняў, якія шыюць для гандлю гатовымі вопраткамі. Гаспадары гэтых майстроўняў, ня гледзячы на агульны рост дарагоўлі, ня толькі не павялічаюць платы сваім работнікам, але яшчэ надумаліся паменшыць і без таго жабрацкія заробкі іх. На гэта работнікі адказалі агульнай забастоўкай, якая адбываецца спакойна, але дружна і згодна.

Гаспадарка „сьвятых айцоў“. Надовячы ў Вільні сталася запраўдная катастрофа, выкліканая апэтытам манахаў манастыра Місіянараў на смачную рыбку...

Да манастыра належыць у самым месьце возера над Вялейкай, у якім разводзіцца рыба для „сьвятых айцоў“. Вада тамака задзержываецца застаўкамі. Вось-жа „айцы сьвятыя“ неяк ленаваліся падыймаць застаўкі, калі ровень вады лішне высака падыймаўся, і замест гэтага пракапалі нейкі равочак, каб вада сама сьцякала праз яго, калі ровень яе лішне высокі. Але сталася так, што за апошнія дні ровень вады—ад выпаўшага дажджу—раптоўна падняўся так, што ніякія равочкі не памаглі, ды вада, сарваўшы застаўкі, люнула на вуліцы места. Цэлы рад дамоў заліты на мэтр увышкі. Каля двухсот асоб асталіся бяз даху над галавой, прымушаныя пакінуць свае дамы з усенькім дабром.

Гожа дадаць, што ў ваколіцах манастырскага возера жыве самая бедната...

Скандальная гісторыя. У мінулую нядзелю ў Вільні разыграўся на вуліцах беспрыкладны скандал. Над ракой Вільлёй гуляла нейкая кумпанія, у якой быў запасны жаўнер. Кумпанія была добра падпіўшы і вяла сабе даволі бурна. Праходзячы міма, нейкі афіцэр зьвярнуў жаўнеру — у вострай форме—увагу на яго паступаньне і патрэбаваў у яго легітымацыю. Жаўнер, аднак, даў яму вельмі рэзкі адказ, і афіцэр паклікаў трох праходзячых міма падафіцэраў, загадаўшы ім арыштаваць і адвясьці жаўнера ў камандатуру. Сабралася вялізарная таўпа народу, якая заняла варожае да афіцэра становішча. Выбраўшы адпаведны мамэнт, арыштаваны жаўнер вырваўся з рук вёўшых яго падафіцэраў і кінуўся ў раку, ды пераплыў на другі бераг. Тут яго затрымала паліцыя, але не надоўга, бо ён зноў кінуўся ў раку і выплыў у іншым месцы. Але яго ўканцы спаймала матёрная лодка. Тымчасам таўпа ўсё расла. Калі жаўнера пасадзілі на звошчыка, каб завясьці ў камандатуру, сярод тысячнае таўпы пачалі раздавацца крыкі: „ня даць яго!“ — „разброіць патрулы!“ — „разброіць паліцыю“! Ураз выпраглі каня, ды скінулі вазака. Узьнялася баталія, у часе якое арыштаваны ўцёк. Толькі, калі прыбыла конная паліцыя і вялікшы патруль жандароў, таўпу ўдалося разагнаць. Пры гэтым чатыры асобы былі заарыштаваны, і справа іх па абвіненьню ў падбурэньні таўпы да разрухаў скіравана да сьледчага судзьдзі. Жаўнера быццам толькі назаўтра злавілі ў другім месцы.

Хаця гэта было ў канцы жніўня, але настроі таўпы, відаць, усё яшчэ... „маёвыя“!

Карэспандэнцыі.

Выбары да валасное рады.

(Біскупіцкая гміна, Ваўкавыскага павету).

5-га жніўня адбыліся ў нас выбары ў валасную раду. З 100 выбаршчыкаў валаснога сабраньня на выбарах былі прысутнымі 92. Было выстаўлена 4 сьпіскі. Чыста сялянскі сьпісак № 4 атрымаў 68 галасоў і правёў 7 радных; шляхоцкі сьпісак № 3—15 галасоў—2 радных (вучыцель і асадзік). Сьпісак № 1 і 2 сялянскія, але знаходзіліся пад уплывам старой рады. № 1 правёў 7 галасамі аднаго раднага, а № 2 праваліўся, бо атрымаў толькі 2 галасы. Войтам застаў абраны селянін з вёскі Пекары, а да павятовага Сойміку работнік слёсар з вёскі Воля. Сяляне ўскладаюць на нова-абраную раду вялікія надзеі, але, як яна выпаўніць яе, пакажа будучыня.

Янка П.

Ганьба моладзі в. Шані.

(В. Шані, Пружанскага павету).

У той час, калі хвалі адраджэнскага руху разьліліся ўва ўсе куткі нашай шматпакутнай бацькаўшчыны, калі тысячамі звальваюцца розныя няшчасьці на карк гаротнага селяніна і калі моладзь другіх вёсак „Заходняй Беларусі“ змагаецца з няшчасьцямі і цемрай, што апавіла нашу старонку, вядучы культурна-асьветную працу, не шкадуючы сваіх маладых сіл, моладзь вёскі Шані сьпіць, насунуўшы шапку на вочы ня бачачы ў гэтым нічога праступнага. Кажу праступнага — бо як можна інача назваць гэткую бязьдзейнасьць моладзі, у тую часіну, калі яна павінна ўсе свае сілы палажыць на тое, каб асьведаміць масу, каб пашырыць сваю родную культуру і асьвету... Няма цяпер у вёсцы Шані ніякай культурна-прасьветнай установы. Быў, праўда, перад разгромам заснаваны гурток Грамады, але ўступіла ў яго толькі каля 20-х асоб, ня гледзячы на тое, што вёска Шані мае блізу 200 хат. А цяпер нічога няма, усё сьпіць. Мала таго, што бязьдзейнасьць моладзі паказала свае прыкрыя вынікі, але што яшчэ горш, дык гэта шкодная праца некатарых грамадзян. Ня буду называць іх прозьвішчаў, мо', прачытаўшы гэтыя радкі, апомняцца яны і, каб пакрыць свае грахі перад Бацькаўшчынай, з падвойнай энергіяй возьмуцца за працу. Браты, ня час спаць! Наша родная старонка кліча вас да сьветлае працы. Хутчэй-жа ідзіце!

Дабучынец.

З Радавае Беларусі.

Высяленьне абшарнікаў.

Польскія газэты перадрукавалі вестку з менскае „Звезды“ аб тым, што ў працягу сёлетняга году на тэрыторыі Радавае Беларусі зьліквідаваны астаткі вялікшых і сярэдніх двароў. Выселены за гэты час 229 сямей зямляўласьнікаў. Адабрана ў іх 2.467 дзесяцін зямлі і інвэнтар на суму 93,103 рублі

Структура і аб'ём працы Інбелкульту на 1927-28 г.

Структура Інбелкульту (Інстытуту Беларускае Культуры) ў 1927-28 г. будзе мець 26 катэдр і 2 асноўныя аддзелы: **аддзел гуманітарны з клясамі:** а) мовы і літаратуры, б) сацыяльна-гістарычнай і в) архэалёгічнай і **аддзел прыроды і гаспадаркі з клясамі:** а) прыроды і б) гаспадаркі. Акрамя гэтых установў, пры прэзыдыуме ІБК будзе камісія па вывучэньню вытворчых сіл і розных установў пры акадэмічнай радзе.

Мае быць узмоцнена навукова-дасьледчая праца камісіі па вывучэньню вытворчых сіл і пастаўлена ў больш адпаведныя ўмовы.

Таксама мае быць зьвернена больш увагі на цыклі грамадзка-эканамічных, пэдагагічных, навуковых і статыстыка-эканамічных дысцыплін і на вывучэньне эканамічнага тавара звароту.

Прызнана патрэбным ужо ў наступным годзе ІБК прыступіць да навукова-дасьледчай працы ў галіне прамысловасьці.

Дзяржплян прызнаў мэтазгодным мэдыцынскую навукова-дасьледчую працу перадаць НК Здароўя. Апошняму даручана распрацаваць праект навукова-дасьледчага мэдінстытуту.

Праца па НАП'а (навук. арган. працы) разам з псыхатэхнічнай лябараторыяй, прызнана мэтазгодным перадаць НКПрацы для арганізацыі пры ім спэцыяльнага інстытуту працы.

Прызнана мэтазгодным замест існуючых паасобных лябараторый (Інбелкульту, Балотнай станцыі, Менскай аграстанцыі) арганізаваць для ІБК і Інстытуту імя Леніна цэнтральную хімічную лябараторыю.

Запрапанавана ІБК сумольна з Інстытутам імя Леніна распрацаваць пэрспэктыўны плян навукова-дасьледчай працы на Беларусі.

Структура і аб'ём працы на 1927 - 28 г. Інстытуту Сельскае і Лясное Гаспадаркі.

Дзяржплян прызнаў неабходным, каб у будучым дасьледчая праца Інстытуту імя Леніна і НКЗ прыняла формы адзінага пляну навукова-дасьледчай працы сельскай і лясной гаспадаркі, прычым аб'яднаць гэту працу павінен Інстытут.

Прызнана патрэбным, каб Інстытут пры сваіх навукова-дасьледчых працах зьвяртаў асаблівую ўвагу на вывучэньне сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы.

Прызнана, што навукова - дасьледчая праца па аддзелу сельска-гаспадарчае эканомікі і аграрнае палітыкі павінна праводзіцца пераважна па пытаньнях арганізацыі сельскай гаспадаркі, сельска-гаспадарчай геаграфіі і статыстыкі. Праца аддзелу лясной гаспадаркі базуецца на цэнтральнай лясной дасьледчай станцыі з яе дасьледчымі лясьніцтвамі.

Па аддзелу мэліарацыі прызнана патрэбным у парадку разгортваньня арганізацыі 2-х станцый: гідралягічнай і гідра-леса-мэліарацыйнай, прычым гідралягічную станцыю намечана арганізаваць у 1927-28 г. На падрыхтоўчую працу па арганізацыі гідра-леса-мэліарацыйнай станцыі — прызнана неабходным адпусьціць у 27-28 г. адпаведныя сродкі.

Дзяржплян лічыць мэтазгодным перадачу Інстытуту імя Леніна Палескай опытнай станцыі і арганізацыю на новым месцы Палескай балотна пяшчанай станцыі.

Прызнана патрэбным арганізацыя пры Інстытуце 2-х новых аддзелаў—жывёлагадоўлі і расьлінагадоўлі з 5 дасьледчымі станцыямі.

Дзяржплян падтрымлівае хадайніцтва аб арганізацыі пры Інстытуце імя Леніна Беларускай геаграфічнай абсэрваторыі за кошт усесаюзнага бюджэту.

На чужыне.

I.

Сэрца, адкуль усё гэта насланьне?
Вачыш, адзін я, як вецер у полі.
Кажкі мне хочацца, сьпеваў і волі!
Сум без пары гэта—сілы кананьне.

Валаеш, шчыра кахаў я дзяўчыну,
Кожнаму верыў, каб долю спаткаці —
Ды на чужыне во мушу шукаці
Лёс свой — і моўчкі, бязглузда тут гіну.

А калі зноў пачануць баламуціць
(Кожнаму ласа ратая прыдбаці!), —
„З кім мне ісьці? хто з табой, мая Маці“.
Радасьць мая цяпер толькі лятуценьі!

II.

Адчыні вакно мой сыне,
Хай паветра ў хату хлыне
І замры... ні — ні!

Слухай, мо пачуеш гукі
Роднай песьні, роднай мукі —
Бацьку разбудзі.

Перамога будзе духа;
Прыйдзе час, кранецца вуха
Покліч, дзіўны гімн.

Тады вернемся да дому,
Каб ня кланяцца нікому,
Вольнымі пакон.

Будзем ў Менску, ў Вільні госьці,
Пахаваюць нашы косьці
Пад айчыны звон!

Serbie, 1927. **М. Запольскі.**

Рэдактар-Выдавец: П. Кушпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.